# МЕТАДЫЧНЫЯ РЭКАМЕНДАЦЫІ ПА ВЫКАНАННІ КАНТРОЛЬНЫХ РАБОТ

Па выніках самастойнай працы студэнт абавязаны прадставіць пісьмовую работу (па выбару: рэферат, эсэ, анатацыя).

## 1. Віды пісьмовых работ і рэкамендацыі па іх напісанні

**1.1. Рэферат** – самастойная праца над тэмай, пры напісанні якой выкарыстоўваецца некалькі навуковых артыкулаў і манаграфій.

**Рэкамендацыі па напісанні рэфератаў:**

1. Выбірайце цікавую для сябе тэму.

2. Уважліва азнаёмцеся з асноўнай і дадатковай бібліяграфіяй па тэме. Памятайце, што жанр рэферата прадугледжвае не перапісванне чужых публікацый, а самастойны пераказ асноўнага зместа навуковай літаратуры.

3. Прадумайце змест і структуру працы (уводзіны, асноўная частка, заключэнне).

– Ва ўводзінах ставіцца праблема, акрэсліваюцца задачы рэферата.

– Асноўная частка змяшчае матэрыял па тэме, сістэматызаваны і размешчаны ў лагічнай паслядоўнасці.

– У заключэнні робяцца высновы, зробленыя пасля вывучэння сабранага матэрыяла.

Дапускаецца не выдзяляць гэтыя часткі асобнымі загалоўкамі ў тэксце.

4. Рэферат трэба пісаць лаканічна, навукова-літаратурнай мовай. Не выкарыстоўвайце тэрміны, значэнне якіх Вам не зразумела.

5. Рабіце ў тэксце спасылкі на выкарыстаныя публікацыі.

6. Аб’ём – да 10 старонак (14 шрыфт Times New Roman, 1–1,5 міжрадковы інтэрвал).

## Прыкладная тэматыка рэфератаў

1. Археалогія як навука. Месца археалогіі ў сістэме гуманітарных і прыродазнаўчых навук.
2. Археалагічная спецыялізацыя *(агляд аднаго ці некалькіх накірункаў археалогіі – эксперыментальнай, падводнай, паветранай, індустрыяльнай, ваеннай і інш.).*
3. Метады археалагічных даследаванняў *(агульная характарыстыка альбо паглыбленая характарыстыка аднаго з метадаў па выбару).*
4. Развіццё археалагічнай навукі. Персаналіі *(рэгіён, перыяд – па выбару студэнта).*
5. Паходжанне чалавека. Асноўныя этапы антрапагенэзу.
6. Ніжні палеаліт. Алдувайская і ашэльская эпохі.
7. Позні палеаліт. Эпоха мусцье.
8. Праблема першапачатковага засялення тэрыторыі Беларусі.
9. Археалагічныя культуры фінальнага палеаліту на тэрыторыі Беларусі *(агульная характарыстыка альбо характарыстыка адной з культур па выбару).*
10. Палеалітычнае мастацтва.
11. Мезаліт: агульныя прыкметы эпохі.
12. Археалагічныя культуры мезаліту на тэрыторыі Беларусі *(агульная характарыстыка альбо характарыстыка адной з культур па выбару).*
13. Неаліт: агульныя прыкметы эпохі.
14. “Неалітычная рэвалюцыя”.
15. Археалагічныя культуры неаліту на тэрыторыі Беларусі *(агульная характарыстыка альбо характарыстыка адной з культур па выбару).*
16. Мастацтва неаліту.
17. Тэхналогія старажытных вытворчасцяў *(від матэрыялаў – крэмень, бурштын, костка, кераміка і інш.; рэгіён, перыяд – па выбару студэнта).*
18. Кераміка як гістарычная крыніца.
19. Старажытная металургія.
20. Энеаліт. Эпоха ранняга бронзавага веку (агульная характарыстыка).
21. Бронзавы век стэпавай паласы Усходняй Еўропы.
22. Бронзавы век Цэнтральнай Еўропы.
23. Археалагічныя культуры бронзавага веку на тэрыторыі Беларусі *(агульная характарыстыка альбо характарыстыка адной з культур па выбару).*
24. Эпоха ранняга жалезнага веку (агульная характарыстыка).
25. Скіфскія і сармацкая культуры.
26. Мастацтва скіфаў.
27. Жалезны век Цэнтральнай Еўропы *(агульная характарыстыка альбо характарыстыка адной з культур па выбару).*

28. Жалезны век лясной паласы Усходяй Еўропы *(агульная характарыстыка альбо характарыстыка адной з культур па выбару).*
29. Археалагічныя культуры жалезнага веку на тэрыторыі Беларусі *(агульная характарыстыка альбо характарыстыка адной з культур па выбару).*
30. Вялікае перасяленне народаў па даных археалогіі.
31. Паходжанне ўсходніх славян па даных археалогіі.
32. Славянскія помнікі другой паловы I тыс. н.э. на тэрыторыі Беларусі.
33. Старажытнасці балтаў другой паловы I тыс. н.э. на тэрыторыі Беларусі.
34. Узнікненне Русі паводле археалагічных даных.
35. Нарманская тэорыя: за і супраць у святле археалагічных даных.
36. Раннефеадальная вёска.
37. Гандлёвыя сувязі насельніцтва Старажытнай Русі.
38. Культура старажытнарускіх гарадоў *(агульная характарыстыка альбо характарыстыка аднаго з аспектаў па выбару).*
39. Рамяство Старажытай Русі *(агульная характарыстыка альбо характарыстыка аднаго з аспектаў па выбару).*
40. Старажытны Ноўгарад.
41. Старажытнарускія гарады на тэрыторыі Беларусі (*характарыстыка аднаго з гарадоў па выбару).*
42. Феадальныя замкі на тэрыторыі Беларусі *(агульная характарыстыка альбо характарыстыка аднаго з замкаў па выбару).*
43. Хрысціянства на Русі па даных археалогіі.
44. Археалагічныя помнікі канкрэтнага раёна *(агульная характарыстыка помнікаў аднаго з раёнаў Беларусі – па выбару студэнта. Інфармацыя адлюстравана ў кнігах серый "Зборы помнікаў", "Памяць").*
45. Гарады Беларусі ў эпоху позняга сярэднявечча паводле археалагічных даных (*характарыстыка аднаго з гарадоў па выбару*).
45. Познесярэдневяковыя замкі на тэрыторыі Беларусі сярэднявечча паводле археалагічных даных (*агульная характарыстыка альбо характарыстыка аднаго з замкаў па выбару).*
46. Неўмацаваныя познесярэдневяковыя паселішчы на тэрыторыі Беларусі паводле археалагічных даных (*агульная характарыстыка альбо характарыстыка аднаго з населеных пунктаў па выбару).*

**1.2. Анатацыя** – кароткі пераказ зместу публікацыі (як правіла, кнігі, зборніка і г.д.).

## Рэкамендацыі па напісанні анатацыі

1. Уважліва прачытайце выбраную публікацыю.

2. Напішыце анатацыю па наступнаму плану:

– Актуальнасць тэмы;

– Асноўныя задачы, якія былі пастаўлены аўтарамі;

– Структура працы (колькасць глаў, раздзелаў і інш., наяўнасць ілюстратыўных матэрыялаў, каталогаў і інш. дадаткаў);

– Кароткі змест структурных частак;

– Заключэнне, вызначэнне адрасатаў выдання (кола патэнцыяльных чытачоў).

Дапускаецца не выдзяляць гэтыя часткі асобнымі загалоўкамі ў тэксце.

3. Аб’ём – да 5 старонак (14 шрыфт Times New Roman, 1–1,5 міжрадковы інтэрвал).

## Тэматыка анатацый

Для напісання анатацыі дапускаецца выкарыстоўваць публікацыю са змешчанага ў ЭВМК бібліяграфічнага спіса альбо іншую навуковую манаграфію па выбару.

**1.3. Эсэ** – гэта самастойнае сачыненне-разважанне над навуковай праблемай пры выкарыстанні ідэй, канцэпцый, вобразаў з іншых абласцей навукі, літаратуры, уласнага вопыту і г.д. Гэта творчы від самастойнай вучэбнай дзейнасці студэнтаў.

## Рэкамендацыі па напісанні эсэ

1. Вызначце тэму эсэ і не адхіляйцеся ад яе.

2. Прадумайце змест і структуру працы (уводзіны, асноўная частка, заключэнне). Вызначце тэзісы, якія будуць раскрывацца ў эсэ.

3. Коратка фармулюйце тэзісы ў пачатку эсэ, у асноўнай частцы іх разгортвайце, у заключэнні – рабіце высновы, якія суадносяцца з агучанымі тэзісамі.

4. Аргументуйце свае думкі. Менш апісання і больш аналізу праблемы.

5. Рабіце ў тэксце спасылкі на выкарыстаныя публікацыі.

6. Аб’ём – да 5 старонак (14 шрыфт Times New Roman, 1–1,5 міжрадковы інтэрвал).

### Прыкладная тэматыка эсэ

1. Функцыі археалогіі ў сучасным свеце.
2. Праблема прававой аховы археалагічных помнікаў.
3. Праблема барацьбы з нелегальным стварэннем і абаротам археалагічных калекцый.
4. Археалогія і палітыка.
5. "Да каго належыць мінулае?": праблемы ўзаемаадносінаў археолагаў і мясцовага насельніцтва.
6. Роля археалогіі ў барацьбе з паранавуковымі ўяўленнямі аб мінулым.
7. Шляхі папулярызацыі археалагічнай спадчыны Беларусі.

## 2. Патрабаванні па афармленні пісьмовай работы

1. Работа павінна быць аформленая ў адпаведнасці з метадычным дапаможнікам "Курсовая и дипломная работы, магистерская диссертация. Правила подготовки, оформления и защиты. Мн. 2009".

Дапускаецца афармленне бібліяграфічных спісаў не ў адпаведнасці з правіламі ВАК, а па спрошчанай схеме:

а) Прозвішча аўтара Ініцыялы. Назва манаграфіі. Месца выдання. Выдавецтва. Год выдання.

б) Прозвішча аўтара Ініцыялы. Назва артыкула // Назва часопіса (зборніка). Месца выдання. Год выдання. Нумар выпуску (тома). Нумары старонак.

2. Абавязковымі структурнымі часткамі пісьмовай работы з'яўляюцца:

– тытульны ліст з указаннем прозвішча, імя і імя па бацьку студэнта, нумароў курса, групы, года выканання работы, а таксама віда работы (рэферат, анатацыя і г.д.) і яе тэмы;

– наяўнасць у пачатку работы яе плана (пры напісанні рэферата);

– наяўнасць у канцы работы спіса выкарыстанай літаратуры. Публікацыі прыводзяцца ў алфавітным парадку – па першай літары прозвішча аўтара.

– наяўнасць спасылак па выкарыстаную літаратуру. Спысылкі ставяцца альбо ўнізе старонкі, альбо ў тэксце.